*Л.Я. Клімуць*

# САРМАТЫЗМ І АДНОСІНЫ ДА ЯГО РАМАНТЫКАЎ 19 ст.

Сувязь паміж рамантызмам і сарматызмам толькі на першы погляд здаецца немагчымай.

Рамантычнае мастацтва, і ў прыватнасці літаратура, на землях былой РП цесна зніताваны з агульнаеўрапейскай ідэалогіяй нацыяналізму. Падзелы РП былі не проста пераломнай падзеяй у гісторыі дзяржавы, яны вызначалі пераход ад старой Польшчы з яе традыцыйнай культурай да новай Польшчы. Але якой яна павінна была стаць? Такім чынам, рамантыкі апынуліся ў цэнтры працэсу афармлення нацыянальнай свядомасці, усведамлення сябе сярод народаў Еўропы, працэсу, які адпавядаў агульнаеўрапейскаму накірунку.

1820 – 30-я гады былі асаблівым часам. Пакаленне, якое жыло пры апошнім каралі РП Станіславе Аўгусце Панятоўскім, ужо адыходзіла. Адбывалася змена пакаленняў. А гэта азначала, што жывая памяць сведкаў замянялася пісьмовым запісам і інтэрпрэтацыяй гісторыкаў. Такія ўмовы былі асабліва спрыяльнымі для стварэння сістэмы нацыянальных міфаў. Паколькі жывая памяць станавілася гісторыяй, а ўмовы хутка мяняліся, тое, што заставалася ў памяці, станавілася прадметам рамантычнай перапрацоўкі, і так узнікала паэтычная аснова нацыянальнага самаўсведамлення.

Рамантыкі належалі да першага пакалення тых, хто нарадзіўся пасля падзелаў, і натуральна, што іх цікавасць да нацыянальнага мінулага была моцнай. Рамантыкі з сімпатыяй угдядаліся ў так званыя сармацкія традыцыі. Яны цікавіліся звычаямі, поглядамі і ўяўленнямі старой шляхты. Іх паэтычныя натуры лічылі старую шляхецкую культуру праявай культурнай асаблівасці народу РП.

Сарматызм быў асаблівай ідэалогіяй шляхты. У палітыцы ён праявіўся ў рэспубліканскіх поглядах і непрыняцці абсалютызму як заходняга, так і Маскоўскага тыпу. Сарматызм уключаў любоў да свабоды, рыцарскі кодэкс, павагу да мінулага, прастасць і суровасць нораваў.

Ясна, чаму эпоха Асветніцтва з такой пагардай ставілася да сарматызму. Да таго ж сарматызм асацыяваўся з набожнасцю і верай у цуды, што натуральна адвяргалася Асветніцтвам.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, сарматызм як культурная сістэма быў поўнай супрацьлегласцю Асветніцтву. Таму ў другой палове 18 ст. сарматызм упамінаецца толькі ў негатыўным сэнсе. Сарматызм становіцца сінонімам адсталасці, неадукаванасці, правінцыялізму і традыцыяналізму як супрацьстаянне рэфарматарскім памкненням часткі грамадства.

Рамантыкі ў канцы 1820-х г.г. выступілі супраць такіх негатыўных адносінаў да сарматызму. У той жа час трэба ўсведамляць, што рамантыкі выступалі ўвогуле супраць духу Асветніцтва.

Сапраўдная рэабілітацыя традыцый старой шляхты адбывалася ў час паўстання 1830 – 31 г.г. і пасля яго Ваяўнічая атмасфера тых часоў спрыяла ажыўленню шляхецкіх традыцый.

Паколькі праблема сувязі рамантызму з сарматызмам вельмі шырокая, мы засяродзімся толькі на тым, як сармацкае мінулае ўплывала на паэтычныя погляды рамантыкаў.

З аднаго боку, развілося так званае польскае месіянства, з другога боку, аднавілася цікавасць да кансерватыўных ідэй. Польскае рамантычнае месіянства прадстаўлена перш за ўсё эмігрантамі, і сярод іх галоўнай фігурай з'яўляецца А.Міцкевіч. Пострэвалюцыйны кансерватызм развіўся пасля паражэння паўстанняў і ўвабраў у сябе многія ідэі сармацкага мінулага.

Рамантызм былой РП грунтаваўся на гістарычным мінулым у большай ступені, чым у іншых краінах Еўропы, дзе кантраст паміж былой славай і сучасным заняпадам быў не такі моцны ці не існаваў увогуле.

Рамантычнае месіянства ўпершыню набыло ўвасабленне ў творах А.Міцкевіча. А.Міцкевіч асабліва падкрэсліваў хрысціянскую духоўнасць, якая пранізвала сацыяльнае жыццё РП. А.Міцкевіч і рамантыкі адкрылі ў сарматызме самую сутнасць нацыянальнай ментальнасці.

У першай палове 19 ст. мяжа паміж літаратурай і гістарыяграфіяй не была ясна вызначана. І пісьменнікі, і гісторыкі выкарыстоўвалі даступныя ім дакументы і запісы, спрабуючы перадаць дух мінулага. Для земляў былой РП гэта было асабліва характэрна, таму што пасля 1831 г. тут не існавала нацыянальнай сістэмы адукацыі, і літаратура ў некаторай ступені замяняла гісторыю. Яна сілкавала нацыянальную годнасць праз усведамленне свайго роду і паходжання.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова